ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1988
ЧАЦВЕР
29
ВЕРАСНЯ
№ 24 (1582)

## АНОНС

НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАМУ ІНСТЫТУТУ ФІЗІКА-ХІМІЧНЫХ ПРАБЛЕМ НАШАГА УНІВЕРСІТЭТА СПАЎНЯЕЦЦА ДЗЕСЯЦЬ ГАДОЎ. ЯГО АРГАНІЗАЦЫЯ НА БАЗЕ ДАСЛЕДЧЫХ ЛАБАРАТОРЫЙ ХІМІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА З'ЯВІЛАСЯ ВАЖНЫМ ФАКТАРАМ У РАЗВІЦЦІ ХІМІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ, У ПАВЫШЭННІ ІХ ФУНДАМЕНТАЛЬНАЙ НАКІРАВАНАСЦІ І ПРАКТЫЧНАЙ ЗНАЧНАСЦІ.

СЕННЯ Ў НУМАРЫ ЧЫТАЙЦЕ РАСКАЗ АБ ЗНАХОДКАХ І ДАСЯГНЕННЯХ НА ТВОРЧЫМ ШЛЯХУ, ПАДРЫХТАВАНЫ КАРЭСПАНДЭНТАМІ ГАЗЕТЫ СУМЕСНА З СУПРАЦОЎНІКАМІ ІНСТЫТУТА (ГЛЯДЗІЦЕ 2-Ю СТАРОНКУ).

Беларускі універсітэт
## ТЭЛЕТАЙП
*ЎЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА*

### РАЗГЛЕДЗЕЎШЫ ПРАДСТАЎЛЕННІ

камісій па прэміях Ленінскага камсамола Беларусі, за высокія дасягненні ў працы, у галіне навукі і тэхнікі, літаратуры, мастацтва, журналістыкі і архітэктуры, педагагічнай дзейнасці бюро ЦК ЛКСМБ пастанавіла прысудзіць прэміі Ленінскага камсамола Беларусі 1988 года і прысвоіць званне «Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі»:

у галіне навукі і тэхнікі:

Комру Паўлу Вяслававічу, старшаму навуковаму супрацоўніку НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі;

Сіняковічу Сяргею Георгіевічу, малодшаму навуковаму супрацоўніку НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі.

у галіне мастацтва:

народнаму ансамблю танца «Крыжачок» БДУ імя У. І. Леніна (мастацкі кіраўнік і балетмайстар М. Харламаў)

М. ТАРАСАВА.

### АЛІМПІЙСКАЯ ВЫШЫНЯ!

Якая яна запаветная для кожнага спартсмена. Для Камандара Маджыдава, студэнта юрыдычнага факультэта нашага універсітэта, яна аказалася дасягальнай. Гэта вопытны барэц. Раней ён быў ужо чэмпіёнам Еўропы і свету.

На Алімпіядзе ў час апошняй сустрэчы са сваім сапернікам балгарынам Жыўкам Вангелавым у барцоўскім Палацы спорту «Сангму» Камандар праявіў вялікую ўпартасць, настойлівасць, паказаў высокі прафесіяналізм. За паўтары мінуты да заканчэння схваткі пры ліку 2:2 барэц удала правёў трохачковы кідок, які і забяспечыў яму перамогу і званне алімпійскага чэмпіёна.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

### ЯК ЛЕПШ ПАДАРОЖНІЧАЦЬ?

Члены народнай агітбрыгады «Фенікс» нашага універсітэта паспрабуюць упэўніць вас, што для гэтага неабавязкова звяртацца ў бюро падарожжаў і экскурсій. Для гэтага дастаткова быць... удзельнікам мастацкай самадзейнасці. «Фенікс» ужо пабываў на БАМе, у Кішынёве, Адэсе. А не так даўно яны вярнуліся з гастрольнай паездкі па Краснаярскаму краю. Спадабаліся гледачам урыўкі з праграм «Фантазія для будучага», «Тры санеты аб вечным каханні».

З. МІХНЕВІЧ.

ВІКТАРЫНА

## Без мінулага няма будучага

Камітэт камсамола універсітэта запрашае прыняць удзел у віктарыне, прысвечанай 70-годдзю ўтварэння ВЛКСМ.

1. Калі была створана камсамольская арганізацыя Белдзяржуніверсітэта?
2. Якімі ўзнагародамі адзначана універсітэцкая арганізацыя ЛКСМБ?
3. Назавіце Герояў Савецкага Саюза — выпускнікоў БДУ.
4. Каго з Герояў Сацыялістычнай Працы, лаўрэатаў Ленінскай прэміі — выпускнікоў БДУ вы ведаеце?
5. Калі быў створаны першы цалінны атрад? Хто яго ўзначальваў?
6. Калі быў сфарміраваны першы студэнцкі будаўнічы атрад? Колькі студэнтаў удзельнічала ў працоўным семестры 1988 года?
7. Назавіце універсітэцкія калектывы мастацкай самадзейнасці, якія носяць званне «народны».
8. Назавіце алімпійскіх чэмпіёнаў, чэмпіёнаў свету і СССР — выпускнікоў і студэнтаў універсітэта.
9. Назавіце жанчын — сакратароў камітэта камсамола БДУ імя У. І. Леніна.
10. Якія падзеі ў жыцці універсітэта цесна звязаны з іменем Г. К. Жукава?

Адказы на віктарыну просім даваць пісьмова. Іх прымуць у ідэалагічным аддзеле камітэта камсамола універсітэта (галоўны корпус, пакой 306) да 26 кастрычніка. Не забывайце, калі ласка, указаць сваё прозвішча, імя, імя па бацьку, факультэт, курс, групу.

Пераможцаў чакаюць каштоўныя падарункі.

АРГКАМІТЭТ.

УВАГА! КОНКУРС!

## ...А патаргаваць можна

САВЕТ маладых вучоных і спецыялістаў універсітэта праводзіць конкурс на лепшую навуковую работу сярод маладых вучоных. Удзельнічаць у конкурсе могуць навуковыя супрацоўнікі, выкладчыкі, стажоры і аспіранты. Узрост іх не павінен перавышаць 35 гадоў.

На конкурс прымаюцца манаграфіі, брашуры, адбіткі артыкулаў, копіі аўтарскіх пасведчанняў з кароткай агульнай анатацыяй або рэферат з неабходнымі па тэксту ілюстрацыямі, з указаннем крыніц, дзе апублікавана работа.

Кожная з пададзеных работ суправаджаецца водгукам-рэкамендацыяй кафедры (лабараторыі) і савета маладых вучоных факультэта (інстытута), характарыстыкай навуковай і грамадскай дзейнасці аўтараў, а таксама водгукам знешняй арганізацыі. Работы, якія прадстаўляліся на конкурс раней, другі раз не разглядаюцца.

Пераможцы агульнауніверсітэцкага конкурсу на лепшую навуковую работу сярод маладых вучоных узнагароджваюцца дыпломамі рэктарата, камітэта камсамола і савета маладых вучоных І і ІІ ступеней. Аўтарам шасці лепшых работ прысуджаецца таксама грашовая прэмія памерам 50 рублёў.

Работы пераможцаў конкурсу ў першую чаргу прадстаўляюцца на саісканне прэмій Ленінскага камсамола Беларусі, іншых прэмій, зацверджаных ЦК ВЛКСМ і ЦК ЛКСМБ, АН СССР для маладых вучоных.

Работы на конкурс прымаюцца да 1 лістапада гэтага года ў п. 148 галоўнага корпуса БДУ.

Д. ГАРБАЧЭЎСКІ,
загадчык навукова-вытворчага сектара савета маладых вучоных БДУ імя У. І. Леніна.

ПОЗІРК З-ПАД БРЫВА

## КУДЫ ЗНІКАЕ СВЯТА?








*ЯШЧЭ некалькі месяцаў назад гэтыя транспаранты былі сапраўдным упрыгожаннем дэманстрацыі, падкрэслівалі ўрачыстасць першамайскага свята, а зараз... Нікому непатрэбны хлам абы як згружаны... Дзе б вы думалі? У 16-м пакоі галоўнага корпуса універсітэта. Здымкі, якія вы бачыце, не зусім адпавядаюць рэчаіснасці: такі беспарадак толькі з прыходу, а далей, далей проста немагчыма прабрацца. На дзіва непрыступная атрымалася барыкада.*

*— А куды больш прыстасаваць аднаразавую атрыбутыку? На наступнае свята зробім бругую,— лічаць у камітэце камсамола універсітэта.*

*— А чаму яе павінен берагчы камендант корпуса? — «законна» абураецца апошні.*

*Праўда, пажарная служба, здаецца, патрабавала ў мэтах бяспекі навесці парадак. Але гэта толькі «здаецца», бо ўбачыць усё на свае вочы не пашанцавала. Ніяк не змаглі адчыніць дзверы гэтага пакоя-звалкі. Праблема засталася закрытай, наўмысна ці выпадкова — невядома. А хацелася б ведаць.*

*М. ДЗЯБЕЛА.*
*Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.*

ІНТЭРВ'Ю ПАСЛЯ ПАДЗЕІ

## Дзень прапагандыста: вынікі, адозвы, пажаданні

***24 верасня ва універсітэце прайшоў дзень прапагандыста. Яго ўдзельнікі абмяркоўвалі пытанні арганізацыі і правядзення заняткаў у рамках палітычнай адукацыі, праслухалі лекцыю аб праблемах сацыяльнага і эканамічнага развіцця нашага грамадства.***

***Выказаць свае думкі, падвесці своеасаблівы вынік гэтага мерапрыемства наш карэспандэнт папрасіў намесніка сакратара парткома па ідэалагічнай рабоце М. Э. Часноўскага, кіраўніка палітычнага семінара кафедры філасофіі гуманітарных факультэтаў А. В. Хоміч і кандыдата эканамічных навук, старшага навуковага супрацоўніка інстытута эканомікі АН БССР лектара А. П. Мораву.***

М. Э. ЧАСНОЎСКІ: Сістэма палітадукацыі ва ўніверсітэце існуе у некалькіх асноўных формах. Частка маладых выкладчыкаў набывае веды ва універсітэце марксізму-ленінізму. Метадалагічныя праблемы па профілю падраздзяленняў абмяркоўваюцца на большасці кафедраў у вучэбных і даследчых лабараторыях у час метадалагічных семінараў. Арганізоўваюцца палітычныя семінары. Для тых, хто не мае вышэйшай адукацыі, мы прапануем заняткі ў палітычнай школе, дзе абмяркоўваюцца па сутнасці тыя ж пытанні, але існуе ўласная методыка выкладання: пераважна лекцыя-расказ. Нарэшце, не адмаўляем мы і індывідуальнай формы палітычнай адукацыі. За актыўную прапагандысцкую дзейнасць у сістэме палітадукацыі па выніках мінулага года ганаровымі граматамі ўзнагароджаны загадчык кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта С. Р. Драбязко, дацэнт кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў Л. Ф. Кузняцова, загадчык кафедры гісторыі філасофіі і логікі А. А. Міхайлаў, дацэнт кафедры навуковага камунізму У. В. Роўда, аспірант кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў М. А. Сілін.

В. ХОМІЧ:

— Мой прапагандысцкі стаж — два гады. На такіх сустрэчах бывала некалькі разоў. На жаль, акрамя дадатковай навуковай інфармацыі ад лектара нічога новага для сябе не бяру. Таму ўпэўнена: патрэбна дыскусія, тады будзе значна цікавей, жывей.

А. П. МОРАВА:

— Для мяне гэта першая лекцыя перад прапагандыстамі універсітэта. Сустракаць у аўдыторыі кампетэнтных людзей, вядома, прыемна. Як, дарэчы, і весці з імі гутарку. Так ва ўсялякім разе разлічвала я. А сапраўднай гутаркі не атрымалася.

Лічу, што найлепшай формай абмену думкамі была б дыскусія. Але падрыхтаваць яе намнога складаней, так што ў наступны раз слова за арганізатарамі. Ім трэба прадумаць план, пытанні дэбатаў і прапанаваць іх удзельнікам. Мне таксама было б цікава пачуць меркаванні сваіх калег, узяць для сябе якія-небудзь звесткі, і размова, я ўпэўнена, пайшла б больш ажыўлена. Некалькі абмяжоўвае строгімі рамкамі і тая акалічнасць, што я атрымліваю «заказ» на лекцыю ў выглядзе гатовай тэмы. Пажадана, каб мне намячалі пэўнае кола пытанняў, а наконт размовы, як, у якой форме яе весці, я дамоўлюся з аўдыторыяй.

Пажаданні і заўвагі слушныя. Рацыянальнае зерне ў іх ёсць. Застаецца толькі, каб арганізатары наступнага дня прапагандыста абавязкова ўлічылі меркаванні ўдзельнікаў мінулага.

Запісаў М. ДЗЯБЕЛА.

